# ТЭМА ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ

## УЛАДЗІМІР ЛІХАДЗЕДАЎ АДНАЎЛЯЕ СТАРОНКІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ




SB.BY

**Аўтарскі гістарычна-асветніцкі праект «У пошуках страчанага» — брэнд, які заваяваў міжнародную вядомасць. А пачыналася ўсё з энтузіязму вядомага гісторыка, калекцыянера, пісьменніка Уладзіміра Ліхадзедава, які вырашыў падзяліцца ўнікальнымі ведамі пра гістарычна-культурную спадчыну краіны. Ён назапашваў і паглыбляў іх, збіраючы калекцыю старых паштовак і фотаздымкаў. Дэбют адбыўся ў 2004 годзе на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня». Праект хутка заваяваў любоў чытачоў, прымусіў па-новаму глязець на гісторыю беларускіх гарадоў і мястэчак, адкрыў унікальныя факты і слаўныя імёны.**

З тых часоў пад рубрыкай «У пошуках страчанага» з'явіліся сотні артыкулаў, а калі дадаць да іх публікацыі ў газетах «Звязда», «Голас Радзімы» ды іншых, то лік ідзе на тысячу з лішнім матэрыялаў. Кожная такая публікацыя суправаджалася ўнікальнымі ілюстрацыямі, большасць з якіх шырокай публіцы былі прадстаўлены ўпершыню.

Прайшло і больш за сто персанальных выстаў у Беларусі ды за мяжой, выдадзена 27 кніг-альбомаў на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, французскай, польскай, арабскай і турэцкай мовах. Менавіта гэтыя кнігі, у аснове якіх публікацыі ў «СБ. Беларусь сегодня», сталі аб'яднальным цэнтрам праекта. Альбомы набылі міжнародную вядомасць, пабывалі на кніжных выставах у Франкфурце-на-Майне, Варшаве, Вільнюсе, Маскве, іншых гарадах свету, па іх пішуць і школьныя сачыненні, і кандыдацкія дысертацыі.

Вельмі каштоўна, што праект Уладзіміра Ліхадзедава паказвае Беларусь шматнацыянальную і шматканфесійную. Альбомы, прысвечаныя святым Аляксандру Неўскаму і князю Уладзіміру, былі выдадзеныя па дабраславенні тагачаснага мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Кніга «Тадэвуш Касцюшка» двойчы прэзентавана ў Бібліятэцы кангрэса ЗША ў Вашынгтоне, альбом «Сінагогі» — у тым жа горадзе, у музеі Халакоста. У анатацыі да кнігі «Тадэвуш Касцюшка» былы саветнік прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Збігнеў Бжэзінскі адзначыў: «Займальная ды інфарматыўная кніга пра выдатнага героя двух брацкіх народаў: палякаў і беларусаў, якія змагаўся не толькі за іх свабоду, але і за свабоду амерыканцаў. Прыхільнасць Касцюшкі да праў чалавека, сацыяльнай справядлівасці і нацыянальнага суверэнітэта з'яўляецца трывалым сведчаннем яго гістарычнай велічы».

Кнігу Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь і ісламскі свет» Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў ходзе афіцыйнага візіту ў Дзяржаву Катар падарыў музею ісламскага мастацтва ў горадзе Доха. Унікальнае даследаванне было прэзентавана і на адмыслова скліканай сустрэчы кіраўнікоў дыпламатычных місій пры ААН дзяржаў — членаў Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку 27 сакавіка 2015 года. Валянцін Рыбакоў, у той час намеснік Міністра замежных спраў Беларусі, тады выказаў надзею, што кніга «Беларусь і мусульманскі свет» дапаможа дзяржавам — членам АІС больш даведацца пра Беларусь, пра яе паважлівае стаўленне да мусульман і ісламу, намеры ўмацоўваць шматпланавае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва на міждзяржаўным узроўні.

— Я займаюся вяртаннем у Беларусь артэфактаў яе гісторыі, — распавядае Уладзімір Аляксеевіч. — Мне заўсёды крыўдна бачыць, як яны расцякаюцца па свеце… Дарэчы, мая калекцыя — не толькі паштоўкі і старыя фатаграфіі. Гэта і друкаваныя станкі, пісьмовыя прыборы, падшыўкі газет, кнігі. Частку калекцый я падарыў беларускім музеям, перадаў для вывучэння ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Я хачу, каб знойдзенае мной было даступна народу.


Замак князя Паскевіча. Пачатак XX ст.


Полацк. Від на горад і помнік 1812 г. Пачатак XX ст.


Гомель. Мужчынская гімназія. Пачатак XX стагоддзя.


Мінск. Крамы на рагу Губернатарскай вуліцы і Саборнай плошчы. Пачатак XX ст.



Уладзімір Ліхадзедаў

**Дэкан факультэта філасофіі ды сацыяльных навук Беларускага Дзяржуніверсітэта Вадзім Гігін:**

— Сёння праект «У пошуках страчанага» мае некалькі кірункаў. Да яго праяўляюць цікавасць не толькі чытачы газеты і наведнікі выстаў, але і дыпламатычныя прадстаўніцтвы, грамадскія дзеячы, дзяржаўныя ўстановы культуры. Трэба рухацца наперад па абранай дарозе, падобна таму, як гэта робіць Уладзімір Ліхадзедаў. Яго калекцыя ўнікальная! У іншых такой няма. А ў нас, у Беларусі, ёсць, чым можам ганарыцца.

**Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў:**

— Уладзімір Ліхадзедаў — чалавек, неабыякавы да гісторыі краіны, энтузіяст. Ён узнавіў скарынаўскі друкаваны станок, на якім упершыню не толькі была надрукаваная кніга па тэхналогіі Францыска Скарыны, але і венецыянская карта XVI стагоддзя, якая дазваляе ідэнтыфікаваць беларускія землі. Перадача асобнікаў аднаўленай карты ў дар Нацыянальнай і Прэзідэнцкай бібліятэкам, найбуйнейшым музеям, у тым ліку і нашаму, — вялікая і радасная падзея, асабліва сімвалічная была ў год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

## Што кажуць спецыялісты

**Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі:**

— Адразу скажу дзякуй «СБ» за праект «У пошуках страчанага». З калекцыянерам Нацыянальная бібліятэка заключыла пагадненне і стварыла ў сябе імянны фонд Уладзіміра Ліхадзедава. Ён перадаў бібліятэцы ўнікальныя гістарычныя артэфакты — напрыклад, выданні 1800 года аднаго з віленскіх манастыроў, збор «Гродзенскіх губернскіх ведамасцяў» за 1841–1849 гады, унікальныя дакументы XVI — XVII стагоддзяў… Усе рарытэты даступныя для карыстальнікаў бібліятэкі, будуць алічбаваны і ўведзены ў абарот. Акрамя таго, праводзіцца сумесная выставачная дзейнасць.

**Кірыл Сокал, Маскоўскі Дзяржуніверсітэт імя М. В. Ламаносава, пісьменнік, кандыдат геаграфічных навук:**

— Такой аўтарскай кніжнай серыі няма не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. А можа быць і ў свеце. Выдавецкая дзейнасць калекцыянера ўражвае! Ведаю, што магутны штуршок у падтрымцы Уладзіміра Ліхадзедава ў частцы альбомнага выкладу філакартысцкага матэрыялу дала і беларуская дзяржава. І што самае важнае — і кнігі, і альбомы, і газетныя, часопісныя публікацыі ўтрымліваюць істотны тэкставы матэрыял. З выданнямі можна ісці ў школу, у студэнцкія аўдыторыі. Паштоўка можа і павінна дапамагаць вывучаць гісторыю краіны.

Людміла **Рублеўская**




SB.BY